Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 5 (628) Пятніца, 18 лютага 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

## 23 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ А
## СЛАВА НАШАМУ МАГУ
## АБАРОНЦУ МІРУ ВА ЎСІМ

## ЗАЎСЁДЫ ВА ЎСІМ З ІЛЬІЧОМ!
## БЫЦЬ СВЕТЛАЙ ЯВАЮ КАМСАМОЛЬСКІМ МАРАМ!
## АКТЫЎНАСЦЬ І ЯШЧЭ РАЗ АКТЫЎНАСЦЬ, КАМСАМОЛІЯ!

Шырокім фронтам ідзе абмеркаванне камсамольцамі «Эстафеты», ідэю якой падаў камітэт камсамола універсітэта. Многія пярвічныя арганізацыі на парадак дня сваіх сходаў ужо ставяць абмеркаванне задач камсамольскай двухгодкі.

Да чаго яны зводзяцца?

Перш за ўсё да таго, што ў аснову свайго студэнцкага жыцця кожны малады чалавек павінны ўзяць тры прынцыпы: «Вучыцца па Леніну!», «Працаваць па Леніну», «Жыць па Леніну!».

Прымаючы «Эстафету», універсітэцкая камсамолія фактычна ставіць перад сабой вялікую і высокародную мэту. А мэта, вядома, была і ёсць важным крытэрыем творчага пад'ёму, творчай актыўнасці мас.

Мэта, мара — гэта, калі сказаць іншымі словамі, наша імкненне дасягнуць чагосьці. Але іншы раз, кажуць, «жартаваць з марай небяспечна: разбітая мара — гэта ўжо няшчасце». Гэта на самай справе так. У жыцці не ўсё ідзе доора і гладка. І калі маладому чалавеку вырысоўваюць яго будучае ў яркіх ружовых фарбах, а на справе яно разыходзіцца з рэчаіснасцю, то ў яго часам чэзне вера ў сілу арганізацыі, нараджаецца скептыцызм. Адсюль і маральныя траўмы, і расчараванне, і душэўныя хістанні маладога чалавека.

Для таго, каб наша мара не заставалася «разбітай», мы павінны абмеркаваць — наколькі здзяйсняльныя нашы мары, нашы задачы. Ці па плячы яны нам?

А яны нам па плячы! Нашы планы не «манілаўскія», пражэкцёрскія, а планы ўпаўне рэальныя. Яны маюць пад сабой трывалую глебу аб'ектыўнай рэчаіснасці. Глеба гэта — шматгадовы вопыт работы нашай камсамольскай арганізацыі і яе поспехі.

Наша моладзь упаўне справіцца з гэтымі задачамі, асіліць іх, калі яна ўсур'ёз адчуе рэальнасць мэты, якую ставіць, будзе змагацца за яе здзяйсненне. Інакш любое пачынанне застанецца крыклівым, прыгожым лозунгам, які павісне ў паветры, калі пры яго здзяйсненні не будзе вызначана канкрэтнае месца кожнага члена нашага калектыву.

За што ж нам змагацца? За чалавека! За тое, каб выхаваць ва універсітэце не проста фізіка, філолага, гісторыка (як ужо пісалася ў мінулым нумары нашай газеты), а фізіка-прапагандыста, фізіка-арганізатара, фізіка-чалавека. Адным заклікам падняць энтузіязм і высокае грамадскае самапачуццё нельга. Няправільна думаць, што, напрыклад, дастаткова запісаць маладога чалавека ў той ці іншы гурток, дабіцца, каб ён пасляваў у вучобе, і чалавек аўтаматычна стане свядомым, маральна стойкім.

Фізіка-прапагандыста, арганізатара, чалавека можа выхаваць толькі калектыў, камсамол. Ён дае ідэйную мэтанакіраванасць чалавеку. Ён праз калектыў дапамагае яму маральна акрэпнуць, асэнсаваць сябе, вызначыць свой жыццёвы шлях, ацаніць свае сілы, развіць грамадскую актыўнасць. Над гэтай праблемай зараз працуюць цэлыя інстытуты грамадскай думкі. І ўсе яны прыходзяць да аднаго: імгненным наскокам гэтую праблему не вырашыш. Для яе паспяховага вырашэння патрэбен не адзін «ударны» год. Пытанне гэтае больш складанае і больш важнае, чым можа паказацца на першы погляд. Бо дзе знайсці тую мерку, якой бы можна было вымераць грамадскую актыўнасць студэнта.

Напрыклад, цяпер, калі ў пярвічных арганізацыях падводзяць вынікі сваёй работы за першы семестр, у актыў залічваюць і тых, хто ходзіць у гурткі мастацкай самадзейнасці, хто займаецца на факультэце грамадскіх прафесій, хто ходзіць на трэніроўкі ў спартыўныя секцыі. Атрымліваецца, што ў групах амаль усе актывісты. На самай жа справе гэта не так.

Канешне, і заняткі спортам, і наведванне сходаў, і ўдзел у мастацкай самадзейнасці — гэта праяўленне актыўнасці маладых людзей, якое так ці інакш мае грамадскае значэнне. Безумоўна, гэта ўдзел у грамадскім жыцці. **АЛЕ ЁСЦЬ ДВА ВІДЫ ПРАЯЎЛЕННЯ ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ: УДЗЕЛ У ГРАМАДСКІМ ЖЫЦЦІ І ЎДЗЕЛ У ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ.** Першы можа праяўляцца ў форме прысутнічання на якім-небудзь мерапрыемстве (на сходзе, лекцыі, дыспуце) ці ў задавальненні сваіх асабістых інтарэсаў (спорт, спевы). **ДРУГІ ВІД ГРАМАДСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ — ПАЗІТЫЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ,** стварэнне чагосьці патрэбнага для калектыву, грамадства. Прымаючы ўдзел у грамадскай дзейнасці, юнак ці дзяўчына ўжо гэтым самым ідзе ў нагу з грамадскім жыццём.

Вось з гэтага нам і трэба зыходзіць. І наша задача — прыцягнуць кожнага юнака і дзяўчыну нашага універсітэта іменна да **ГРАМАДСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**, развіць іх навыкі арганізатара грамадска-карысных спраў.

Яшчэ раз скажу, што гэтая задача нам пад сілу. Трэба толькі кожнаму задумацца над сэнсам свайго жыцця, розумам і сэрцам адчуць веліч гэтай задачы, адчуць тую вялікую адказнасць камсамольца за арганізацыю, павысіць патрабавальнасць да сябе і сваіх таварышаў, адчуць сваю сілу і сілу калектыву, яшчэ вышэй падняць барацьбу за славу нашага універсітэта, за званне студэнта, не зганьбіць і не ўнізіць гэтае званне і паставіць перад сабой яшчэ і асабістую мэту: «Што зраблю я персанальна для дакладу Ільічу ў дзень яго нараджэння».

**М. ЦІВА.**

## УЧОРА Ў МІНСКУ АДКРЫЎСЯ XXIII З'ЕЗД ЛКСМ БЕЛАРУСІ.
## ПАЛЫМЯНАЕ ПРЫВІТАННЕ ДЭЛЕГАТАМ КАМСАМОЛЬСКАГА ФОРУМА!

# МАЦНЕЮЦЬ СУВЯЗІ

*Ва універсітэцкім таварыстве «Веды» шмат добрых спраў. Цяжка нават пералічыць, колькі прачытана лекцый, праведзена гутарак у гарадах і вёсках рэспублікі па самых актуальных і цікавых праблемах нашай рэчаіснасці. Асабліва ўзрасла сувязь прапагандыстаў таварыства з рабочымі заводаў, фабрык, з працоўнымі калгасаў і саўгасаў у сувязі з падрыхтоўкай да важнай падзеі ў нашым жыцці — XXIII з'езда КПСС. Гэтай падзеі ўсё больш і больш прысвячаецца лекцый і выступленняў.*

*А нядаўна вялікая група вучоных — членаў таварыства «Веды»— сустракалася з воінамі — прафесар С. П. Кесарава, дацэнты Н. П. Крывашэеў, М. Я. Рэзнікаў, Д. М. Карулін, М. П. Баранава, В. Я. Крышчановіч, кандыдат філалагічных навук В. С. Карабан, аспірант А. Л. Врублеўскі і іншыя.*

*Вучоныя расказалі аб дасягненнях нашай навукі ў такіх галінах, як біёніка, фізіка, хімія, кібернетыка. З цікавасцю былі сустрэты расказы аб гісторыі Маскоўскага Крамля, краінах Афрыкі і шмат якія іншыя.*

*Прысутныя цёпла сустрэлі прапагандыстаў, адміністрацыя ўзнагародзіла іх граматамі.*

# У ЧЫМ НАШЫ ПРАЛІКІ

Агульнавядома, што сесія — гэта не толькі адзнакі ў залікоўках. Яны паказчык таго, як студэнт вучыцца, працуе. У нашай групе раней не было не тое што правала, але і тройка рэдка ў каго пападалася. Група ў паспяховасці займала адно з першых месц ва універсітэце. Нас нават хацеў прафком за поспехі ў вучобе ўзнагародзіць пуцёўкай на экскурсію.

Але што здарылася ў гэтую сесію — цяжка паверыць. Факты — рэч упартая, яны гавораць аб тым, што з трыццаці чалавек палова мае тройкі, а шэсць па аднаму ці нават па два завалы.

Чаму такая перамена? На гэтае пытанне адказвала група на сваім партыйным сходзе. Галоўнае, адзначылі камуністы, не выкарыстаны ўсе мажлівасці вучэбнага семестра. Мінулыя поспехі некаторым студэнтам ускружылі галаву. Тым часам семінары не адзін раз паказвалі, што мы ўсё яшчэ слаба рыхтуемся да заняткаў, што не ўсе студэнты вядуць падрабязныя канспекты. Некаторыя з іх за семестр прапусцілі шмат лекцый, што таксама не магло не аказаць адмоўнага ўплыву на ход вучобы. Асабліва слабыя веды паказала група па дыялектычнаму матэрыялізму. Гэта гаворыць аб тым, што камуністы мала цікавіліся распарадкам працоўнага дня курса, а таксама наведваннем лекцый асобнымі студэнтамі.

Цяпер мы адчуваем, у чым нашы пралікі. У будучым нам трэба больш увагі звяртаць на вучобу кожнага студэнта, сачыць за падрыхтоўкай да практычных заняткаў. Але самае галоўнае, на маю думку, камуністам самім трэба быць заўсёды ў авангардзе, сваім асабістым прыкладам паказваць, як трэба выкарыстоўваць усе мажлівасці для паспяховай вучобы. На жаль, не ўсе камуністы паказваюць яго. Толькі на добрым прыкладзе камуністаў кожны студэнт можа зразумець, што вучоба—гэта наша жыццё, наша неадкладная і першачарговая задача.

Цяпер камуністы курса ўзялі кірунак на тое, каб самім весці ўлік, як той ці іншы студэнт падрыхтаваўся да семінара, як ён вядзе сябе на лекцыях, што робіць у вольны час?

Калі мы будзем выконваць гэта—поспех будзе з намі.

*А. СЛУКА,*
*сакратар партгрупы II курса аддзялення журналістыкі.*



У пяцікурснікаў нашага універсітэта пачалася работа над дыпломнымі. Наш фотакарэспандэнт А. Кадзет сфатаграфаваў дыпламантку біялагічнага факультэта Іну Лепяшынскую і яе кіраўніка Тацяну Ігараўну Баканчыкаву ў час лабараторных даследаванняў.

# НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

Нам заўсёды прыемна сустракацца з савецкімі людзьмі, юнакамі і дзяўчатамі, піянерамі і школьнікамі.

Так было і на гэты раз.

Групу в'етнамскіх, самалійскіх і кубінскіх студэнтаў запрасілі на свой інтэрнацыянальны вечар дружбы піянеры і школьнікі старэйшых класаў сярэдняй школы № 2 беларускай сталіцы.

Да пачатку вечара нас прынялі дырэктар школы Уладзімір Ігнатавіч Ляпёшкін, завуч Алена Рыгораўна Каласоўская і старшая піянерважатая Зінаіда Сцяпанаўна Ялсукова. Яны расказалі нам шмат цікавага пра сваю школу, пра яе гісторыю, цікавіліся вучобай дзяцей у школах нашых краін.

На вечары мы расказалі піянерам і школьнікам 7—8 класаў аб барацьбе нашых народаў за мір, за сваё светлае будучае, аб лёсе дзяцей у нашых краінах у мінулым і сёння, аб тым, як вучымся, жывем у Мінску. Нас ад імя ўсіх піянераў вітала старшыня клуба інтэрнацыянальнай дружбы Ала Садыкава.

Пасля нас, гасцей, прынялі ў ганаровыя піянеры: самыя юныя вучні 4-га класа—выдатнікі вучобы, якія прысутнічалі на вечары, павязалі нам чырвоныя гальштукі.

А калі пачаўся канцэрт, мы таксама спявалі песні нашых народаў,—песні гераічнага в'етнамскага народа спявалі в'етнамскія студэнты фізічнага факультэта; кубінец Віктар Бартэлемі, з падрыхтоўчага факультэта, спяваў песні аб Востраве Свабоды. А калі ён пачаў «Марш 26 ліпеня»—яго падтрымала ўся зала. Самалійскія студэнты пазнаёмілі прысутных з самалійскімі нацыянальнымі песнямі: «Мая прыгожая Радзіма», «Песня самалійскіх піянераў», «Песня дружбы» і іншымі.

Затым усе спявалі «Хай заўжды будзе сонца!»

Гэтай сустрэчы мы не забудзем, як і не забудзем нашых крылатых песень, гарачых поціскаў моцных дружбай рук.

**Ахмед Магамед АДЭН,**
**самалійскі студэнт падрыхтоўчага факультэта.**